Васіль ГРЫНЬ
(г. Заслаўе)

# РЭГІЯНАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ СВЯТЫ НА ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ АСНОВЕ: «ЗАСЛАЎСКІ НАБАТ» 2002 – 2003 гг.




Ідэя фестывалю сярэднявечнай традыцыі і культуры «Заслаўскі набат» нарадзілася, як гэта не парадаксальна, на маёй прыватнай кухні. У працэсе генерыравання абрысаў будучай імпрэзы ўдзельнічаў мой даўні сябар Фёдар Міхееў – лідэр мінскага рыцарскага клуба «Княжы гуф»[1]. Цікава, што, дзякуючы волі і амбіцыям двух чалавек, ідэя мусіла два разы паспяхова матэрыялізавацца. Неўзабаве рознымі шляхамі ў аргкамітэт свята намі былі далучаны: Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Рыцары Вялікага княства», Заслаўскі гарвыканкам, Заслаўскі гісторыка-культурны запаведнік, газета «Туризм и Отдых», турагенцтва «Magister vita», гістарычны факультэт БДПУ імя М.Танка.

Адносна сацыяльнай запатрабаванасці і рэнтабельнасці свята магчыма сказаць наступнае: чысціня жанру і дакументальнасць могуць быць рэнтабельнымі і карыснымі для інвестараў. Насельніцтва г. Заслаўля Мінскай вобласці складае 15000 чалавек. У дні свята ў 2002 годзе горад наведала 8000 турыстаў, у 2003 годзе – 20000 турыстаў. Прыбытак горада толькі за фэст 2002 года склаў 20000$. У 2003 годзе за наведванне рэканструкцыі аблогі аддзелам культуры Заслаўскага райвыканкама з гледачоў фестывальных падзей былі сабраныя сродкі, якімі наведвальнікі пакрылі свой абавязковы ўнёсак у фонд будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Маю даволі вялікі досвед наведвання імпрэзаў, прысвечаных сярэднявеччу па-за межамі Беларусі (Прыбалтыка, Польшча, Чэхія, Аўстрыя, Германія, Шатландыя). Асноўны прынцып, якога я імкнуўся прытрымлівацца пры планаванні «Заслаўскага набата», –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

2 «Княжы гуф» паслядоўна працуе над аднаўленнем вайсковых strояў і зброі менавіта беларускіх земляў, даволі актыўна з 1990-х гг. удзельнічае ў мінскіх і рэспубліканскіх святах і фестывалях. У 2003 г. яго ўдзельнікаў запрашалі на здымкі фільма «Ночной дозор». Электронны адрас клуба kniajiguf@mail.ru.

жанравая чысціня і дакументальнасць. У Еўропе праводзяць фэсты-fantasy рэканструктараў-медыявістаў не знітаваныя з былымі мясцовымі падзеямі, гісторыяй пэўнага народа. Нам гэта рабіць было нецікава. Пры планаванні мы таксама мелі на ўвазе, што калі гэта фэст рэканструкцый сярэднявечнай культуры, то відавочна, што караоке, шашлыкі, свята горада, ансамблі балалаек і баянаў, бальныя і эстрадныя танцы і г.д. тут недарэчы, і з пункту гледжання логікі, і ў адпаведнасці з элементарным густам. Таму ў межах «Набата» адбыліся наступныя падзеі: выстава, прысвечаная роду Глябовічаў, заслаўскіх магнатаў; парад і прэзентацыя рыцарскіх клубаў; канцэрт сярэднявечнай музыкі; «горад майстроў»; выступленне батлейкі (сярэднявечнага беларускага лялечнага тэатра); рыцарскі турнір цяжкаўзброеных латнікаў; конныя «зшыбкі» рыцараў; рыцарскія бугурты – групавыя бойкі рыцараў; паказальнае выступленне ў гістарычным жанры мінскага коннага клуба «Продзіус»; фэст «Заслаўскі дуднік» – выступленні беларускіх дудароў (Уладзь Пузыня, Уладзь Бярбераў, Алесь Лось, Алесь Жура, Зміцер Сасноўскі, пан Скіргайла, Вячаслаў Калацэй); рэканструкцыя бойкі і аблогі заслаўскага замка ў 1434 годзе.

Як мы інфармавалі сваіх гасцей, фэст быў заснаваны на рэальных падзеях гісторыі Заслаўя. Удзельнікі і гледачы атрымалі магчымасць апынуцца ў суровым сярэднявеччы, стаць сведкамі штурму замка і паглядзець на жыццё нашых продкаў у тыя далёкія часы, убачыць лепшыя беларускія клубы («Княжы гуф», «Берасцейская харугва», «Жалезны воўк», «Дайнава», «Заслаўская харугва», «Золак», «Рыцарскае кап'ё») і калектывы сярэднявечнай музыкі.

У адносінах да пытання дакументальнай асновы правядзення фэстывалю, адзначу наступнае. У падмурак яго цэнтральнай падзеі – рэканструкцыі бойкі і аблогі заслаўскага замка ў 1434 годзе – было пакладзена папярэдняе асэнсаванне арганізатарамі летапісных, гістарычных, мастацтвазнаўчых крыніц. Фабула гістарычнай сітуацыі аблогі наступная. У 1430 годзе, пасля смерці Вітаўта, Вялікім Князем Літоўскім становіцца Свідрыгайла. Літоўскія баяры, незадаволеныя палітыкай Свідрыгайлы, у 1432 годзе паднялі мяцеж. Дзяржава падзялілася на Вялікае Княства Літоўскае на чале з Жыгімонтам і, прызнаўшае ўладу Свідрыгайлы, Вялікае Княства Рускае з цэнтрам у Полацку. Ахвярай ваеннай віхуры стала і Заслаўе, уладальнік якога, князь Андрэй, спачатку падтрымліваў Свідрыгайлу, а пасля перайшоў на бок Жыгімонта. Летапіс 1433 г. паведамляе: *«Того ж лета собрал Швидригайло великую силу и мистра лифляндского со всеми лифлянты взял себе на помощ, и пошли силно в Литовскую землю. И ночевал за полторы мили от Вильни в Рудомине, и минувши Вилну пошол на Старые Троки, и стоял под Троки четыре дни, и не добыл, пошол проч искати Жигимонта и войско его. И стоял у Ешишка четыре дни и пошол проч во свою землю. И первое пришол к Креву и стояли два дни, и добыл города каменного Крева, и выжег огнём, и людей много посекли и в полон повели. И оттоле пошли на Молодечно. И пришла к нему весть,*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*што Литва идёт за ним в погоню, и князь Швидригайло послал на Литву князя Михаила, воеводу киевского, и иных князей много русских, и побили пана Петра Монкгирдовича и всю Литву, а иных живых поимали. И оттоле пошол Швидригайло к Жеславлю, и в один день(Заслаўе – аўт. ) взял, и посад выжгли, и людей много в полон повели, и много лиха учинили Великому Княжеству Литовскому, и пошли в свою землю рускую».*

Неўзабаве пасля гэтага трагічнага здарэння ўмацаванні Заслаўскага замка былі адноўлены і, нават, удасканалены. У той жа час Свідрыгайла быў разбіты пад Вількамірам у 1435 годзе, а ягоныя ўладанні перайшлі да Жыгімонта.

Удалая рэканструкцыя аблогі Заслаўя адбылася сіламі ўдзельнікаў рыцарскіх клубаў на гарадзішчы «Вал» у натуральных дэкарацыях з рэшткаў фартыфікацыйных пабудоў Заслаўскага замка XVI-XVII стст. і кальвінскага збору (Спаса-Прэабражэнская царква) XVI-XVII стст. перад некалькімі тысячамі зацікаўленых гледачоў 8 верасня 2002 года. Распачалася імпрэза калакольным набатам, які некалі папярэджваў продкаў заслаўчан пра набліжэнне ворагаў, а нашым сучаснікам мусіць нагадаць пра небяспеку страты уласных каранёў і гістарычнай памяці. Рэканструкцыя аблогі была добра падрыхтавана, і таму сталася сапраўднай кульмінацыяй фестывальных падзей, якія неўзабаве завяршыліся ўрачыстым закрыццём свята.

У працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята мы кіраваліся, перш за ўсё: патрэбай у творчай, навуковай і эстэтычнай самарэалізацыі, патрыятызмам і жаданнем спрыяць абуджэнню гістарычнай і культурнай памяці беларусаў. Жадалі стварыць умовы рэалізацыі творчага і камунікатыўнага патэнцыялу шырокага кола гістарычна свядомай беларускай моладзі, падвесці пад іх дзейнасць аўтэнтычную дакументальную базу, а не штучную хімеру. Цяжка дакладна вызначыць, чаму ініцыятыва не знайшла паразумення і стабільнай падтрымкі на дзяржаўным узроўні. Варта пазначыць, што намаганні энтузіястаў, акрамя фінансавых, арганізацыйных маюць і ўласна фізіялагічныя абмежаванні – Фёдара Міхеева, напрыклад, пасля фэсту 2002 года паклалі ў рэанімацыю з сардэчным прыступам.

Пасля другога фэсту мы перапынілі супрацоўніцтва з Заслаўскім райвыканкамам. Зараз, у фармаце сваіх абавязкаў менеджэра фірмы «Magister vita», я мушу рабіць імпрэзы абранага некалі накірунку для карпаратыўнага сектару, паколькі: а)захаванне знойдзенай эстэтыкі «беларускай гістарычнай медыявістыкі» мне падабаецца; б)гістарычнасць і аўтэнтычнасць рэнтабельныя – за іх плацяць спажыўцы; в)праца ў накірунку далучэння людзей да гістарычнай спадчыны краіны – праява маёй сацыяльнай пазіцыі як гісторыка і грамадзяніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Без нашай дапамогі ў Заслаўі дагэтуль не было з'яў такога маштабу як «Набат». У Заслаўі спрабавалі рабіць стандартныя святы-капуснікі, але прывабіць на іх гледачоў не змаглі. У выніку шмат страцілі перш за ўсё ўдзельнікі фэсту, творча апантаная моладзь, турысты і гледачы, якія пры сустрэчах заўжды дзячаць за мінулыя святы і пытаюць: «Калі адбудзецца наступнае?»

Напрыканцы варта дадаць, што досвед «Заслаўскіх набатаў» сведчыць аб наступным.

- Рэгіянальна-гістарычныя святы на дакументальнай аснове – дзейсны сродак патрыятычнага выхавання, які сёння мае ўсе аб'ектыўныя падставы стаць перыядычнай падзеяй і ў жыцці мястэчка, у якім свята наладжана, і ў культурным жыцці краіны.

- Пры ўдзеле ў аргкамітэце спецыялістаў і неабыякавых да справы асобаў, такія святы рэнтабельныя камерцыйна і сацыяльна запатрабаваныя.

- Вопыт «беларускай гістарычнай медыявістыкі» ў XXI стагоддзі варты ўвагі з пункту гледжання этнаэкалогіі беларусаў, паколькі ў галіне відовішчнай індустрыі даволі моцныя тэндэнцыі скіраванасці на фэнтэзійныя, наднацыянальныя, маскультурныя стандарты.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ